парадоксальные образы. Таким образом, в христианской культуре было в порядке вещей сдвигать нормы собственных догм, примером чего может служить сам образ Иисуса Христа – «презренный», «достойный поругания», он, наоборот, стал типичным образом неописуемой божественный красоты. И, продолжая мысль, символом церкви в конечном итоге стало не что иное, как орудие пыток – крест.

Эти темы не могли не отразиться в культовой литературе. В своё время Ф. М. Достоевский отозвался об этой теме в своём романе «Идиот» устами одного из персонажей: *«На картине этой изображён Христос, только что снятый с креста… это в полном виде труп человека, вынесшего бесконечные муки ещё до креста, раны, истязания, битьё от стражи, битьё от народа, когда Он нёс на Себе крест и упал под крестом, и, наконец, крестную муку в продолжение шести часов… Правда, это лицо человека, только что снятого со креста, то есть сохранившее в себе очень много живого, тёплого; ничего ещё не успело закостенеть, так что на лице умершего даже проглядывает страдание, как будто бы ещё и теперь им ощущаемое… но зато лицо не пощажено нисколько; тут одна природа, и воистину таков и должен быть труп человека, кто бы он ни был, после таких мук…»* [3]. Мысль, пропущенная через сито грубого натурализма. Иисус и крест утратили привычные семантические привязки и символы, оставляя после себя обычное измученное тело и не менее измученное орудие пытки. Ф. М. Достоевский показал веру глазами интеллигента, и этот взгляд лишь акцентировал внимание на том безобразном, том антибожественном, что присваивалось изначально демоническому.

Подводя итоги, следует сделать вывод о том, что Ф. М. Достоевский видел те реалии жизни, которые сложно назвать прекрасными. Безусловно, эстетика безобразного в христианской культуре играет одну из ключевых ролей. И, получив преломление через индивидуально-авторское видение великого русского писателя, она подчеркивает прекрасное, придаёт контрасты, плетёт сюжеты, наслаивает смыслы, что, без сомнения, придает данной теме актуальность и художественную востребованность.

**Литература**

1 Мольер, Ж. Б. Тартюф, или обманщик [Электронный ресурс] / Ж. Б. Мольер. – Режим доступа: https://azbyka.ru/fiction/tartjuf-ili-obmanshhik-zhan-batist-moler/. – Дата доступа: 16.04.2024.

2 Достоевский, Ф. М. Преступление и наказание [Электронный ресурс] / Ф. М. Достоевский. – Режим доступа: https://ilibrary.ru/text/69/p.1/index.html. – Дата доступа: 16.04.2024.

3 Достоевский, Ф. М. Идиот [Электронный ресурс] / Ф. М. Достоевский. – Режим доступа: https://ilibrary.ru/text/94/p.1/index.html. – Дата доступа: 16.04. 2024.

**УДК 373.5.091.3:821.161.3-1*Р.Барадулін**

***С. А. Саракалетава***

# МЕТАДЫЧНЫЯ ПАДЫХОДЫ ДА ВЫВУЧЭННЯ ВЕРША “УЦЯКАЛА ЗІМА АД ВЯСНЫ” РЫГОРА БАРАДУЛІНА Ў ШОСТЫМ КЛАСЕ

*У артыкуле разглядаецца методыка работы з вершам Рыгора Барадуліна “Уцякала зіма ад вясны”, якi прапанаваны для вывучэння ў шостым класе. Аўтар паслядоўна разглядае схему працы над лірычным тэкстам і прапануе сістэму заданняў па засваенні вучнямі асноўных тропаў.*

Мова лірычнага твора заўсёды эмацыйна афарбаваная. Таму ў ёй вялікая роля належыць тропам (эпітэтам, метафарам, параўнанням, метаніміям і інш.). Як адзначае В. Рагойша, "менавіта ў сістэмах прамых і пераносных значэнняў слоў і ўвасабляецца перш за ўсё змест паэтычнага твора" [1, с. 74]. Тропы дазваляюць узбагаціць літаратурную мову новымі сэнсавымі адценнямі. Яны дапамагаюць індывідуалізаваць ці ацаніць з'яву, вобразна паказаць яе існасць. Менавіта таму ў раздзеле "Мастацкае слова: вобразнасць, выразнасць, хараство" праграмы па беларускай літаратуры для 6 класа, куды ўваходзіць верш Рыгора Барадуліна "Уцякала зіма ад вясны" [2], вялікая роля належыць працы з тропамі.

Асноўная мэта ўрока – паглыбленне ведаў пра Рыгора Барадуліна як майстра лірычнай пейзажыстыкі ў працэсе аналізу верша "Уцякала зіма ад вясны". *Уступны этап* працы над лірычным творам у якасці магістральнай задачы ставіць стварэнне ў дзяцей эмацыянальнага настрою, адпаведнага пафасу верша. А. Брадзіхіна адзначае, што "неабходная атмасфера можа стварацца праз уступнае слова настаўніка (пра верш, аўтара, эпоху, тэму), якое суправаджаецца метадамі ілюстрацыі і дэманстрацыі (здымкі, слайды, музычнае суправаджэнне, кароткія відэафільмы, выказванні ці ўрыўкі з твораў іншых пісьменнікаў і інш.), што дазволіць узмацніць эфект, уздзейнічаць на розныя органы пачуццяў" [3, с. 41].

Стварэнне псіхалагічнага настрою пры вывучэнні верша "Уцякала зіма ад вясны" Рыгора Барадуліна можа ажыццяўляцца і праз расповед настаўнікам прыпавесці: "Сустрэў падарожнік рабочых, якія апрацоўвалі каменне, і спытаў па чарзе ў кожнага, што ён робіць.

– Ды вось цягаю і абчэсваю гэтае каменне, – з непрыхаванай незадаволенасцю адказаў першы.

– Сумленна зарабляю свой кавалак хлеба, – стрымана паведаміў другі.

А трэці горда і задаволена паведаміў:

– Будую храм.

Давайце і мы пабудуем свой храм – як належыць вывучым верш «Уцякае зіма ад вясны» Рыгора Барадуліна".

Р. Барадулін – майстар мастацкай дэталі, яркіх метафар, гукавых эфектаў. М. Арочка адзначае, што "майстэрства і непаўторнасць Барадуліна-паэта ў многім вырастаюць з даверу да рэчыўнай дэталі і адшуквання ў ёй высокага, рамантычнага, нейкага нябачнага для чытача зместу" [4, с. 603]. Даследчык падкрэслівае, што "стылявая адметнасць паэзіі Р. Барадуліна звязана з тым, што яна надзвычай музычная" [4, с. 607].

Праграма прапануе на гэтым уроку ўпершыню пазнаёміць вучняў з паняццем увасаблення, што можна зрабіць з дапамогай тэарэтычнай даведкі. Тэарэтычная даведка на ўступным этапе неабходна ў тым выпадку, калі без звестак па тэорыі літаратуры вучні не здолеюць адэкватна ўспрыняць твор. Яна падаецца з апорай на засвоенае школьнікамі на мінулым уроку паняцце метафары. Каб замацаваць матэрыял, дзеці могуць прачытаць артыкул падручніка, дзе адзначаецца, што "ўвасабленне – мастацкі прыём, калі нежывым ці неадушаўлёным прадметам і з'явам надаюцца ўласцівасці чалавека або жывых істот. Увасабленне – разнавіднасць метафары. <…> Рыгор Барадулін у вершы «Уцякала зіма ад вясны...» намаляваў запамінальную, зрокава-выразную карціну, поўную рухаў, фарбаў, пачуццяў, эмоцый. Увасабленні дапамагаюць аўтарам паўней раскрыць свае пачуцці, сваё паэтычнае бачанне прыроды і стварыць непаўторныя мастацкія вобразы, а чытачам – выразней уявіць карціны навакольнага свету, спасцігнуць задуму паэта, убачыць у звычайнай, будзённай з'яве высокую паэзію" [5, с. 87].

Першаснае выразнае чытанне лірычнага верша павінна ажыццяўляцца настаўнікам з мэтай пазнаёміць вучняў з творам, стварыць эстэтычнае ўздзеянне. А. Брадзіхіна зазначае, што "найбольшы ўплыў аказвае чытанне настаўнікам на памяць (гэтае патрабаванне становіцца абавязковым, калі верш прызначаны праграмай для завучвання на памяць)" [3, с. 41]. Калі першаснае чытанне даверана вучню, то выразнае чытанне павінна быць адпрацавана ім з настаўнікам загадзя. Пасля заканчэння дэкламацыі неабходна так званая «хвіліна маўчання», паўза ў некалькі секунд, бо лірыка валодае сугестыўнасцю, навявае пэўны настрой, рэзка абарваць які нельга.

На *арыенціровачным этапе* самымі прадуктыўнымі прыёмамі будуць слоўнікавая праца і рэпрадуктыўная гутарка. Лексічная даведка дазволіць патлумачыць вучням незразумелыя словы, няведанне якіх перашкодзіць паўнавартаснаму ўспрыманню твора. Варта памятаць, што няясную лексіку нельга падаваць па-за кантэкстам. Прыкладныя словы, якія могуць быць незразумелымі для вучняў 6 класа ў вершы, наступныя:

– вербалоз (па кустах вербалозаў) – куст ці дрэва сямейства вярбовых;

– каптан (каптан абарвалі) – даўнейшая двухбортная мужчынская і жаночая верхняя адзежына з доўгімі поламі і падоўжанымі рукавамі;

– матляцца (матляецца вата) – часта рухацца з боку ў бок, хістацца;

– крыгалом (звон крыгалому) – перыяд, калі пачынае ламацца лёд на рэках;

– ніцы (трымаюць на ніцых плячах) – той, які мае доўгія звісаючыя галіны (пра дрэвы і кусты).

Рэпрадуктыўная гутарка, спалучаная з выбарачным чытаннем, дапаможа выявіць настрой верша і пачуццё, заключанае ў ім. Настаўнік можа прапанаваць шасцікласнікам наступныя пытанні:

1 Якія пачуцці ў вас выклікаў гэты верш?

2 Якія карціны прыроды ўявіліся вам, калі вы слухалі верш “Уцякала зіма ад вясны”?

3 Якія краявіды прыроднага краю вам найбольш падабаюцца?

*Этап аналізу* можа ўключаць паўторнае чытанне тэксту (лірычны тэкст чытаецца на ўроку некалькі разоў), эўрыстычную гутарку, творчыя заданні, індывідуальную работу па пытаннях, стылістычныя практыкаванні і інш. Падчас аналізу лірыкі тэксту перавага аддаецца паслядоўнаму шляху аналізу. Разгледзім некалькі магчымых заданняў.

1 Паўторнае чытанне верша вучнем і зварот увагі дзяцей на тое, які ж шлях зрабіла зіма, уцякаючы ад вясны.

2 Эўрыстычная гутарка з мэтай навучыцца аргументаваць сваю ацэнку ад прачытанага.

– Ці згодны вы з тым, што верш нагадвае казачную гісторыю?

– Які вобраз вясны паўстаў перад намі? Якая выява ў нас атрымалася?

– Перадайце сваімі словамі, які ж шлях зрабіла зіма, уцякаючы ад вясны.

– Ці ёсць у вершы героі, якім можна паспачуваць? Калі так, то па якой прычыне?

– Хто ў гэтым змаганні дзвюх пор года аказаўся мацнейшым?

– Як у народзе называецца свята, калі сустракаюцца дзве пары года?

3 Метад ілюстрацыі (малюнак М. Ліханенка “Сакавік”), спалучаны з эўрыстычнай гутаркай, з мэтай больш дакладна разабраць твор, растлумачыць, забяспечыць прадуктыўную пазнаваўчую дзейнасць.

– Які настрой пераважае на карціне?

– Якая колеравая гама прадстаўлена ў творы?

– Ці падыходзіць прапанаваны твор жывапісу да твора літаратуры?

– Якія думкі ўзнікаюць у вас пры праглядзе работы М. Ліханенка?

– Ці супадаюць яны з вашымі ўражаннямі і вершам “Уцякала зіма ад вясны” Р. Барадуліна?

4 Заданні на развіццё маўлення з мэтай узнаўлення тэарэтычных ведаў.

– На дошцы размешчана табліца з тэарэтычнымі паняццямі *эпітэт, параўнанне, метафара* і іх азначэннямі ў пераблытаным выглядзе). Задача – правільна расставіць азначэнні паняццяў (табліца 1).

– Якімі эпітэтамі вы б апісалі вясну ў вершы Рыгора Барадуліна? Запішыце ў сшытак.

– Які троп мы не выкарысталі? (Увасабленне).

– Размеркавальная дыктоўка: вучні вызначаюць, у якіх выпадках размова ідзе пра людзей, а ў якіх – пра нежывыя прадметы ці з’явы і размяшчаюць таблічкі ў розныя слупкі (сонца спала, мароз малюе, бяжыць вада, дзяўчынка спала, мастак малюе, бяжыць чалавек).

Табліца 1 – Заданне на аднаўленне зместу тэарэтычных паняццяў

| Паняцце | Азначэнне |
|---|---|
| Эпітэт | Мастацкі прыём, характарыстыка аднаго прадмета, з'явы пры дапамозе супастаўлення яго з іншым на аснове іх падабенства. |
| Метафара | Мастацкае азначэнне, якое вобразна характарызуе з'яву, прадмет, чалавека |
| Параўнанне | Перанясенне ўласцівасцей адной з'явы на другую, чым-небудзь падобную на яе |

На *заключным этапе* павінен ажыццяўляцца культуралагічны падыход. Менавіта ў працэсе вывучэння беларускай літаратуры вучні набываюць этыка-філасофскія, сацыяльна-гістарычныя і эстэтыка-культурныя веды. Прыклад практыкаванняў для матэрыялу на заключным этапе:

1 Вучням трэба скласці сінквейн да слова "вясна", карыстаючыся схемай, якая намалявана на дошцы. Гэта заданне на развіццё маўлення з мэтай падрыхтоўкі да вуснага ці пісьмовага выказвання.

*Вясна*

*Два прыметнікі (вазьміце з тых эпітэтаў, што пісалі раней, або прыдумайце новыя).*

*Тры дзеясловы – гэта нашыя ўвасабленні ў дачыненні да гэтага вобраза, можна прыдумаць свае.*

*Сказ з 4-х слоў (можна з верша)*

*Сінонім асноўнага паняцця.*

Узор верша, які можна прапанаваць вучням, калі яны не сутыкаліся з сінквейнам раней:

*Вясна*
*Цёплая, сонечная*
*Радуе, асвятляе, прыносіць.*
*А вясна даганяла зіму.*
*Прыгажуня.*

2 Праблемная сітуацыя. Якія народныя прыкметы ты ведаеш, звязаныя з надыходам вясны? Прывядзі 2–3 прыклады.

3 Рэпрадуктыўная гутарка з мэтай узнаўлення ведаў, набытых вучнямі са слоў настаўніка, з мастацкага твора, з падручніка.

– Якая тэма гэтага верша?
– Якая асноўная ідэя верша?
– Паспрабуйце растлумачыць сэнс назвы твора.

Такім чынам, пры вывучэнні верша Рыгора Барадуліна "Уцякала зіма ад вясны" вялікая роля належыць працы з тропамі. Увесці новае паняцце ўвасаблення і паўтарыць ужо вывучаныя тэрміны "эпітэт", "метафара", "параўнанне" мы прапануем з дапамогай тэарэтычнай даведкі, размеркавальнай дыктоўкі і сінквейна.

## Літаратура

1 Рагойша, В. П. Паэтычны слоўнік: навуковае выданне / В. П. Рагойша; пад рэд. Т. А. Гарбачэўская, В. У. Мінько, Т. В. Лецьен. – Мінск : Выдавецтва "Беларуская навука", 2004. – 574 с.

2 Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце "Беларуская літаратура" для VI класа ўстаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : https://adu.by/ru/homeru/ obrazovatelnyj-protsess-2023-2024-uchebnyj-god/obshchee-srednee-obrazovanie/uchebnye-predmety-v-xi-klassy/belaruskaya-litaratura.html. – Дата доступу : 15.04.2024.

3 Брадзіхіна, А. В. Методыка выкладання беларускай літаратуры: вучэбна-метадычны комплекс па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасцей 1-02 03 03 Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (англійская), 6-05 0113-02 Філалагічная адукацыя (Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (англійская), 6-05-0232-01 Беларуская філалогія (па напрамках). Прафілізацыя: літаратурана-рэдакцыйная дзейнасць [Электронны рэсурс] / А. В. Брадзіхіна; М-ва адукацыі РБ; Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2012. – Рэжым доступу : https://dot3.gsu.by/course/view.php?id=5849. – Дата доступу : 15.04.2024.

4 Арочка, М. М. Рыгор Барадулін / М. М. Арочка // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. / навук. рэд. У. В. Гніламёдаў [і інш.] / Нац. акад. навук Беларусі, Аддз-не гуманітар. навук і мастацтваў, Ін-т літ. ім. Я. Купалы. – Мінск: Беларус. навука, 2002. – Т. 4, кн. 1: 1966–1985. – С. 594–620.

5 Бельскі, А. І. Беларуская літаратура : вучэб. дапам. для 6-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / А. І. Бельскі, Л. К. Цітова. – 2-е выд., перапрац. і дап. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2016. – 240 с.

**УДК 37.091.33-028.22:37.015.31:811.161.3:821.161.3**

***В. А. Сцепчанка***

## ВЫКАРЫСТАННЕ ПРЫЁМУ “ВОБЛАКА СЛОЎ” НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ

*У дадзеным артыкуле разглядаецца пытанне актывізацыі пазнавальнай дзейнасці вучняў шляхам выкарыстання візуалізацыі на ўроках беларускай мовы і літаратуры на прыкладзе выкарыстання такога прыёму, як “воблака слоў”, прадстаўляецца апісанне дадзенага прыёму і разглядаюцца прыклады і ідэі прымянення “воблака слоў” пры вывучэнні розных тэм.*

Дваццаць першае стагоддзе характарызуецца хуткім развіццём усіх сфер жыцця, у тым ліку і сферы адукацыі. Менавіта хуткае развіццё тэхналогій патрабуе распрацоўкі новых методык выкладання беларускай мовы і літаратуры і мадэрнізацыі тых, якія ўжо існуюць. Акрамя гэтага, пры распрацоўцы новых форм урока трэба улічваць псіхалагічны стан сучасных вучняў, іх інтарэсы і захапленні. Без уліку гэтых асаблівасцей немагчыма распрацаваць якасны ўрок, зацікавіць школьнікаў і стварыць умовы для разумення і запамінання матэрыялу.

Варта адзначыць і тое, што працэс навучання не павінен зводзіцца толькі да засваення і завучвання правіл, прадстаўленых настаўнікам, але і мець творчы характар. “Навучанне – гэта актыўны творчы пошук з боку настаўніка і з боку вучня” [1]. Такім чынам, галоўная задача настаўніка – сфарміраваць працэс перадачы ведаў такім чынам, каб вучні авалодалі навыкам актыўнага навучання і здольнасцю самастойна здабываць веды.

Праблема навуковасці, даступнасці, свядомасці і актыўнасці ставіць перад настаўнікам задачу выяўлення практычным шляхам актыўных метадаў фарміравання і арганізацыі вучэбнай пазнавальнай дзейнасці. Візуалізацыя працэсу навучання становіцца адным са шляхоў вырашэння дадзенай праблемы. Візуалізацыя (ад лац. visualis “глядзець”) – гэта “метад прадстаўлення інфармацыі, фізічных і сацыяльных працэсаў і з’яў, падзей ў выглядзе, зручным для назірання і аналізу – у выглядзе аптычнага малюнка (напрыклад, у выглядзе малюнкаў і фатаграфій, графікаў, дыяграм, структурных схем, табліц, карт і г. д.)” [2].